Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 18:13:33

DOI:10.17951/sb.2022.16.319-322
Studia Białorutenistyczne 16/2022 REVIEWS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Anzhela Melnikava / Анжэла Мельнікава

Francisk Skaryna Gomel State University (Belarus)
e-mail: angelinavel@tut.by
https://orcid.org/0000-0001-8802-6210

# Актуальныя пытанні літаратуразнаўства і крытыкі

**Людміла Сінькова, *Беларуская „звышлітаратура”*. Мінск: Кнігазбор, 2019, 224 с.**

Людміла Сінькова – вядомы і аўтарытэтны даследчык беларускай літаратуры, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У полі зроку вучонага знаходзяцца важныя праблемы развіцця як айчыннай літаратуры, так і літаратуразнаўства. Новая кніга Л. Сіньковай *Беларуская „звышлітаратура”* (Sìn’kova, 2019) прысвечана актуальным пытанням сучаснага літаратуразнаўства: удакладненню паняццяў звышлітаратура, дакументальна-мастацкая проза, асэнсаванню сутнасці літаратуры ў эпоху „скону абсалютаў”, ролі нацыянальнага ў сучасным свеце і ў мастацкай свядомасці, узаемаадносін чытача і аўтара, вызначэнню спецыфікі масавай літаратуры і вытлумачэнню прычын яе папулярнасці сёння.

У раздзеле *Беларуская „звышлітаратура”: Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч, Святлана Алексеевіч* даследчыца звяртаецца да разгляду творчасці названых аўтараў, разважае над актуальнасцю іх твораў сёння. Як вядома, статус класічных, агульнапрызнаных нацыянальнай супольнасцю, маюць тыя творы, з якімі звязаны кардынальны прарыў у мастацкай свядомасці, у якіх асэнсоўваюцца істотныя для нацыі і літаратуры праблемы. Творы В. Быкава, А. Адамовіча цалкам адпавядаюць гэтым крытэрыям. Невыпадкова і сама Л. Сінькова пастаянна звяртаецца да пераасэнсавання твораў В. Быкава, А. Адамовіча, пра што сведчаць яе ранейшыя манаграфіі *Цукровы пеўнік: Літаратурна-крытычныя артыкулы* (Sìn’kova, 1996a), *Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур* (Sìn’kova, 1996b), *Паміж тэкстам і дыскурсам: Беларуская літаратура XX–XXI стст.: гісторыя, кампаратывістыка і крытыка (літаратурная крытыка, артыкулы, гутаркі)* (Sìn’kova, 2013).

І ў рэцэнзуемай рабоце даследчыца доказна абгрунтоўвае наватарскі характар здзейсненага В. Быкавым, А. Адамовічам, які заключаецца ў новых падыходах да

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 18:13:33



адлюстравання тых катастроф, якія перажылі беларусы ў ХХ стагоддзі, даводзіць першынства беларускіх пісьменнікаў у рабоце з фактам, дакументам. Л. Сінькова паказвае, што калі ў кнігах А. Салжаніцына дамінуе яго асабісты вопыт, асоба аўтара, а сам пісьменнік „традыцыйным чынам выкарыстоўваў дакументальныя крыніцы" (с. 38), то для „Алеся Адамовіча і Святланы Алексіевіч зыходнай пазіцыяй было слухаць і фіксаваць, з тым каб выбіраць і рэпрэзентаваць чужое маўленне ў статусе рэальнага, а не прыдуманага" (с. 38).

Творы класікаў заўжды актуальная для нацыянальнай культуры і таму, што яны пастаянна раскрываюцца новымі сэнсамі, а кожнае наступнае пакаленне звяртаецца да іх у пошуках адказу на важнейшыя пытанні часу. В. Быкаў, А. Адамовіч, С. Алексіевіч – пісьменнікі, якія, па словах Л. Сіньковай, імкнуцца „асэнсаваць глабальныя катастрафічныя падзеі сучаснай эпохі" (с. 11). Даследчыца акцэнтуе ўвагу на тым, што В. Быкаў і А. Адамовіч скіроўвалі ўвагу на „неадрэфлексаванасць у масавай свядомасці сэнсу фашызму" (с. 11), на праблемы віны і пакаяння, ахвяр і катаў, „метамарфозы *маленькага чалавека*", на тое, "як шараговыя людзі ператвараюцца ў катаў" (с. 15). Л. Сінькова піша як пра сціплых станоўчых герояў В. Быкава, таксама¸ здавалася б, маленькіх людзей, якія, аднак, у неспрыяльных, трагічных абставінах сцвердзілі сябе як Героі. Так і пра тых, хто „пры любой уладзе застаецца толькі выканаўцам чужой волі і рабом нізкіх інстынктаў; той, хто якраз не ў стане быць Асобай з уласным сумленнм, верай, воляй" (с. 19). Асэнсоўваючы творы В. Быкава, іх змястоўны пасыл, Л. Сінькова прыходзіць да высновы: „У творах Быкава падзенне чалавека ніколі не апраўдваецца ніякімі абставінамі. Наадварот, падкрэсліваецца, што здзяйсняе зло канкрэтны чалавек. Даносіць, гвалціць і націскае на курок ён, а не тыя прычыны-абставіны, якімі ён апраўдвае сябе" (с. 20).

Закранае Л. Сінькова і пытанне, наколькі абгрунтавана разглядаць творчасць В. Быкава „як плён не толькі савецкай, але якраз рускай літаратуры" (с. 26), што дэманструюць расійскія падручнікі па літаратуры, дзе спадчына В. Быкава ўключана ў кантэкст рускай літаратуры на той падставе, што пісьменнік сам перакладаў свае творы на рускую мову. Выснова Л. Сіньковай наступная: „Быкаў па ўсёй сутнасці сваёй (па мове, тэмпераменце, па заяўленай грамадзянскай пазіцыі і публічна сцверджанай нацыянальнай ідэйнасці) самы беларускі пісьменнік – гэта відавочна" (с. 26).

Л. Сінькова асэнсоўвае *Беларускую традыцыю ў творчасці Святланы Алексеевіч*, якая, на думку даследчыцы, заключаецца ў тым, што менавіта беларуская проза ў асобе В. Быкава і А. Адамовіча заклала „канцэптуальны падмурак" для разумення актуальнейшых праблем часу, калі „наратар радыкальна саступае ў цень факта, дакумента" (с. 30). Канешне, можна разважаць і спрачацца, наколькі ў творах С. Алексіевіч наратар адыходзіць на другі план перад фактам, але пісьменніца сапраўды працягвае традыцыі, закладзеныя А. Адамовічам. Л. Сінькова разважае над актуальнасцю сур'ёзнай літаратуры, не той, якая дазваляе прыемна бавіць час, а той, якая спрабуе адказаць на галоўныя пытанні –

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 18:13:33



хто мы, для чаго ў гэтым свеце, на якіх прынцыпах павінны будавацца адносіны паміж людзьмі, „феномен чалавечага сумлення".

Шэраг артыкулаў зборніка прысвечаны асэнсаванню жанравай спецыфікі „дакументальна-мастацкай прозы / літаратуры", удакладненню паняцця *звышлітаратура*, якое было прапанавана А. Адамовічам: *Адметнасці непрыдуманай літаратуры: Аляксандр Салжаніцын і Алесь Адамовіч, Звышлітаратура: ідэя Алеся Адамовіча і плён Святланы Алексіевіч, „Звышлітаратура" і „Крык" Эдварда Мунка.*

У артыкуле *Што можна пазначаць тэрмін „дакументальна-мастацкая проза"* Л. Сінькова прапануе доказную класіфікацыю, якая дазваляе размяжоўваць прозу fiction і non-fiction.

У артыкуле *Прафесія – журналіст, пакліканне – мастак (жанравая спецыфіка дакументальна-мастацкай прозы пра вайну)* Л. Сінькова аналізуе творы, напісаныя журналістамі, іх пісьменніцкія стратэгіі.

У артыкуле *Вайна вачыма беларуса: афганскія апавяданні Сяргея Дубовіка* даследчыца, абапіраючыся на творы названага аўтара, непасрэднага ўдзельніка той вайны, разглядае спецыфіку беларускага погляду на вайну. Згодна з Л. Сіньковай, гэта спецыфіка заключаецца ў Эдамінаванні болю".

Артыкул *Меoriginally* 

Канцэптуальнымі з'яўляюцца разважанні Л. Сіньковай адносна спецыфікі развіцця нацыянальнага пісьменства (артыкул *Дыскрэтным або бесперапынным было развіццё беларускай літаратуры),* дзе аўтар абгрунтоўвае думку пра памылковасць і нават шкоднасць адмаўлення перарывістасці, „катастрафічных спадаў" ў гісторыі беларускага мастацкага слова, шкоднасць абсалютызацыі ідэі гетэрагеннасці: „Гетэрагеннае не тоеснае свядома беларускаму, беларусамі на Беларусі і па-беларуску напісанаму" (с. 100), „беларуская літаратаруа і культура развіваліся менавіта дыскрэтна, а не бесперапынна" (с. 105).

У артыкуле *Карэляцыя як метад у параўнальным вывучэнні літаратур* аўтар піша пра памылковасць адвольнага, абстрагаванага супастаўлення твораў беларускай літаратуры з сусветнымі, „з акцэнтам толькі на выбраных, элімінаваных падставах для суаднясення" (с. 107). Прыкладам жа доказнай і выверанай метадалогіі ў кампаратытыўным даследаванні літаратур, згодна з Л. Сіньковай, выступаюць работы Евы Лявонавай (артыкул *Метадалогія кампратывістыкі паводле Евы Лявонавай).*

Л. Сінькова разважае над пытаннямі: *Што такое масавая літаратура?, Чаму літаратура для мас такая папулярная ва ўсім свеце?, Ці вінаватыя людзі ў тым, што любяць масавую літаратуру? Чаму Бэтман ніколі не пераможа Быкава, Што будзе пасля „World of Tanks"?.* Выснова даследчыцы наступная: масавая літаратура не зможа перамагчы літаратуру сур'ёзную, „бо ў дарослым

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 10/06/2026 18:13:33



жыцці менавіта сур'ёзнае, культурай напоўненае слова дае сэнс, апірышча, арыенціры для быцця ў гэтым свеце" (с. 9).

Шэраг артыкулаў зборніка прысвечаны асэнсавнню плёну навуковай дзейнасці Івана Навуменкі (*У творчай лабараторыі акадэмічнага літаратуразнаўства*), Ігара Жука (*Навуковы стыль прафесара Ігара Жука*), Аляксандра Баршчэўскага *(Пазіцыя Аляксандра Баршчэўскага ў трактоўках біяграфіі і творчасці Уладзіміра Жылкі*).

У артыкуле *Пафас творчасці Эбелавежцаў" у сітуацыі беларуска-польскага памежжа* разглядаецца плён мастацкіх набыткаў пісьменнікаў Беласточчыны. Л. Сіньковай найперш вылучаецца „мастацкая непасрэднасць" іх твораў, „угрунтаванасць у радаводную традыцыю" (с. 169), „нацыянальная культуратворчасць з перспектывай, адкрытай у шырокі свет" (с. 173).

У артыкуле *Интеллектуальная лирика старшего (Янка Юхновец) и младшего (Макс Щур) поколений белорусской эмиграции* пададзены параўнальны аналіз твораў гэтых самабытных аўтараў.

У артыкуле *Рэалізм і мастацкая ўмоўнасць у прозе Васіля Быкава (Па апавяданні „Мурашкі", 2002)* даследчыца асэнсоўвае пошук пісьменнікам новай паэтыкі, зварот да антыўтопіі, фантастыкі, гратэску, абсурду, сцвярджаючы пры гэтым, што нацыянальная ідэя, нацыянальны кантэкст заставаўся вызначальным для В. Быкава.

Выступленні і артыкулы Л. Сіньковай – заўсёды рэзанансныя, глыбокія, прадуманыя. Л. Сінькова – з тых даследчыкаў, якія здольныя прапанаваць важкія навуковыя ідэі. Рэцэнзуемая кніга не стала выключэннем.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Sìn'kova, Lûdmìla. (1996a). *Cukrovy peйnìk: Lìtaraturna-krytyčnyâ artykuly*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Сінькова, Людміла. (1996a). *Цукровы пеўнік: Літаратурна-крытычныя артыкулы*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Sìn'kova, Lûdmìla. (1996b). *Belaruskaâ proza XX stagoddzâ: Dynamìka žanravyh struktur*. Mìnsk: BDU. [Сінькова, Людміла. (1996b). *Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур*. Мінск: БДУ].

Sìn'kova, Lûdmìla. (2013). *Pamìž tèkstam ì dyskursam: Belaruskaâ lìtaratura XX–XXÌ stst.: gìstoryâ, kamparatyvìstyka ì krytyka (lìtaraturnaâ krytyka, artykuly, gutarkì)*. Mìnsk: Parkus Plûs. [Сінькова, Людміла. (2013). *Паміж тэкстам і дыскурсам: Беларуская літаратура XX–XXI стст.: гісторыя, кампаратывістыка і крытыка (літаратурная крытыка, артыкулы, гутаркі)*. Мінск: Паркус Плюс].

Sìn'kova, Lûdmìla. (2019). *Belaruskaâ „zvyšlìtaratura"*. Mìnsk: Knìgazbor. [Сінькова, Людміла. (2019). *Беларуская "звышлітаратура"*. Мінск: Кнігазбор].